*Мармыш Таццяна Міхайлаўна,*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, аспірантка

**Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей,**
**якія апынулся за межамі Беларусі, —**
**стратэгічная ўмова сцвярджэння нацыянальнай ідэнтычнасці**

*Артыкул прысвечаны пытанням рэстытуцыі страчаных нацыянальных культурных каштоўнасцей, якая з 'яўляецца стратэгічным рэсурсам сцвярджэння нацыянальнай ідэнтычнасці. У артыкуле разглядаюцца некаторыя аспекты дзейнасціў сферы рэстытуцыі культурнай*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*спадчыны, што ажыццяўляецца ў Беларусі, выяўляюцца найбольш верагодныя шляхі вяртання культурных каштоўнасцей, перамешчаных за межы краіны ў розныя перыяды гісторыі.*

Сучасныя даследаванні ідэнтычнасці насельніцтва Беларусі канстатуюць ідэнтычнасць беларусаў як нацыянальную. Нацыя ўяўляе сабой этнасацыяльную супольнасць, еднасць якой прадвызначаецца актыўнай сацыяльнай камунікацыяй, дзяржаўна-тэрытарыяльнымі сувязямі, адзінствам семіятычнага поля, якое ўключае мову, сімволіку, карціну свету, мадэлі паводзінаў і інш.: «Нацыя — гэта згуртаваньне людзкіх пакаленьняў, у іхным бязупынным патоку, ніколі няспынянальным і невычарпальным, якія маюць адно расавае паходжаньне, г. зн. у чыіх жылах цячэ адна кроў, хто засяляе адну тэрыторыю, мае свой арыгінальны фізычны і духовы тып, свае звычаі, культуру, гісторыю і народны характар, якім розьняцца ад іншых людзей, гавораць аднэю моваю, ды праяўляюць сваю нацыянальную сьведамасьць і волю» [2, с. 3]. Акрамя таго, умацаванню нацыянальнай ідэнтычнасці спрыяе пачуццё гонару за культурную спадчыну і каштоўнасці, створаныя за гісторыю існавання нацыі яе тытульным этнасам, а таксама рознымі этнічнымі супольнасцямі, якія складаюць нацыю.

Сёння беларуская культура знаходзіцца ў складаным перыядзе развіцця. З аднаго боку — глабалізацыйныя тэндэнцыі і, з гэтым, распаўсюджванне не лепшых узораў масавай культуры, складанае фінансавае становішча, якое не дазваляе рэалізоўваць многія неабходныя праекты ў гэтай сферы. З другога боку — з пачатку 90-х гг. XX ст. назіраецца зварот да раней зусім «белых», закрытых старонак гісторыі, схаваных пластоў гістарычнага мінулага. У сувязі з пераацэнкай ролі культурнай спадчыны ў якасці фактару нацыянальнай ідэнтычнасці прыйшло разуменне неабходнасці яе аховы і захавання. Па-першае, патрабуюць вырашэння праблемы, якія адносяцца да сфер рэстаўрацыі, кансервацыі, рэканструкцыі, аднаўлення помнікаў матэрыяльнай культуры і зберажэння элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія знаходзяцца на тэрыторыі краіны, і па-другое, паўстала пытанне рэстытуцыі страчаных у выніку войнаў, узброеных канфліктаў, наўмысных крадзяжоў нацыянальных культурных каштоўнасцей.

У святле аб'яўлення ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў 2011 г. Годам культурнай спадчыны краін СНД пытанне рэстытуцыі культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спадчыны, якая апынулася за межамі Беларусі, бачыцца важнай і актуальнай.

Панятак «культурная спадчына» набыў асаблівае значэнне за апошняе дзесяцігоддзе. Дадзены тэрмін абазначае сукупнасць рэсурсаў, атрыманых у спадчыну з мінулага, якую людзі лічаць адлюстраваннем і выражэннем вераванняў, ведаў і традыцый, што пастаянна змяняюцца [4], Культурная спадчына з'яўляецца значнай і тыповай для ідэнтытэту супольнасці, якой яна належыць; унікальнай у сацыяльным, эстэтычным, культурным планах, знакавай для насельніцтва тэрыторыі краіны свайго паходжання, важнай пры сцвярджэнні краіны на палітычнай карце свету.

Змястоўна блізкі да панятку «культурная спадчына» тэрмін «культурныя каштоўнасці», які канкрэтызуе культурную спадчыну і ўказвае на пэўныя яе формы — матэрыяльныя (помнікі археалогіі і архітэктуры, комплексныя прыродна-культурныя аб'екты, пісьмовыя і графічныя дакументы, творы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтва і інш.) і нематэрыяльныя (абрады, звычаі, традыцыі, дыялекты, тапаніміка, рамесніцкія тэхналогіі, веды аб прыродзе і сусвеце і інш.).

Пытанні пошуку і рэстытуцыі беларускіх перамешчаных каштоўнасцей знайшлі адлюстраванне ў даследаваннях А. Мальдзіса, Т. Рошчынай, публікацыях У. Гілепа, М. Яніцкай і інш. У перыядычным друку час ад часу з'яўляюцца тэматычныя артыкулы («Советская Белоруссня», «Краязнаўчая газета», «Культура»), Знакавым стаў выхад сямі зборнікаў «Вяртанне», прысвечаных праблеме вяртання нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Беларусі, дзе надрукаваныя спісы страчаных у розныя часы рухомых помнікаў культуры, архіўных матэрыялаў і дакументаў, сабраных грамадскай камісіяй «Вяртанне». Але ўсё ж праблема вяртання культурных каштоўнасцей падаецца недастаткова асэнсаванай і асветленай. Гэта звязана, на наш погляд, з тым, што аб'ект даследавання з'яўляецца па шэрагу прычын (у тым ліку палітыка-сацыяльных) вельмі «далікатным», закранае маральны бок міждзяржаўнага дыялогу.

Канцэптуальна тэрмін «рэстытуцыя» (ад лат. restitutio — аднаўленне) палягае ў сферы права. З юрыдычнага пункту гледжання «рэстытуцыя» ёсць форма матэрыяльнай адказнасці дзяржавы, вінаватай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у здзяйсненні міжнароднай агрэсіі. Рэстытуцыя як від адказнасці прадугледжвае выпраўленне альбо змяншэнне вінаватай дзяржавай нанесенага ёй іншай дзяржаве ўрону шляхам аднаўлення папярэдняга стану маёмасці, у прыватнасці, у форме вяртання маёмасці, нарабаванай на акупаванай тэрыторыі другой дзяржавы [3, с. 23],

У дачыненні да культурных каштоўнасцей рэстытуцыя звязана з вяртаннем матэрыяльных аб'ектаў, пcрамяшчэнне якіх на тэрыторыю іншай краіны не мае прававога пацверджанага абгрунтавання і даказана незаконнае, часцей за ўсё адбылося ў выніку вывазу ў час ваенных дзеянняў адным ваюючым бокам з тэрыторыі дзяржавы-праціўніка.

Рэгуляванне дзейнасці па вяртанні страчаных культурных каштоўнасцей як заканамерны і неабходны вынік масавага разбурэння культурнай спадчыны, асабліва ў час Другой сусветнай вайны, знайшло выражэнне ў шэрагу дакументаў, прынятых міжнароднай супольнасцю. Першым такім дакументам стала Канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту (1954) (Гаагская канвенцыя). Прынятая разам з Першым пратаколам, Канвенцыя прадугледжвае забарону экспарту захопленых каштоўнасцей з тэрыторыі краіны іх знаходжання, наданне «імунітэту» культурным каштоўнасцям, якія знаходзяцца ў час канфлікту ў спецыялізаваных сховішчах, цэнтрах засяроджвання рухомых і нерухомых аб'ектаў спадчыны і інш. Пазней пабачылі свет Рэкамендацыі (1964) і Канвенцыя (1970) аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы права ўласнасці на культурныя каштоўнасці. У 1978 г. быў створаны Міжурадавы камітэт па садзеянні вяртанню культурных каштоўнасцей краінам іх паходжання або іх рэстытуцыі ў выпадку незаконнага прысваення.

У сувязі з пашкоджаннем культурнай спадчыны ў выніку канфліктаў, якія адбываліся ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг., стала актуальнай неабходнасць з'яўлення дадаткаў да ўжо існуючых дакументаў, іх карэкцыя — быў прыняты Другі пратакол да Гаагскай канвенцыі (1999), распрацаваны новыя акты — Канвенцыя ЮНІДРУА аб выкрадзеных або незаконна вывезеных культурных каштоўнасцях (1995), Дэкларацыя ЮНЕСКА, якая датычыцца наўмыснага разбурэння культурнай спадчыны (2003).

За сваю шматвекавую гісторыю Беларусь па шэрагу розных прычынаў страціла шмат культурных здабыткаў. Многія з іх былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перамешчаны за межы Беларусі для захавання ў больш бяспечныя ўмовы ў час войнаў і засталіся так і не вернутымі, частка вывезена ў якасці трафеяў, некаторыя аб'екты шляхам перадачы (размеркавання) трапілі за межы Беларусі ў часы знаходжання краіны ў складзе іншых дзяржаў і інш. Так, напрыклад, з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея, проста «закрытага на ключ» у час акупацыі Мінска з-за адсутнасці загаду аб эвакуацыі, у Германію было вывезена каля 3 000 твораў мастацтва, сярод якіх знаходзіліся «сіняя спальня Аляксандра I» з Зімняга палаца ў Санкт-Пецярбургу, 48 слуцкіх паясоў (большая частка з іх — з калекцыі Радзівілаў), заходнееўрапейскі і беларускі жывапіс і інш. Пасля вайны 600 твораў вярнулася ў Беларусь, у тым ліку і частка Радзівілаўскай калекцыі, аднак яе палова была перададзена Польскай Народнай Рэспубліцы ў якасці сяброўскай дапамогі.

У Беларусі неаднаразова разгортвалася дзейнасць па вяртанні страчаных каштоўнасцей. У 1987 г. пры «Беларускім фондзе культуры» з мэтай арганізацыі сістэмнай работы па пошуку страчаных аб'ектаў спадчыны, канкрэтызацыі метадаў іх вяртання, фарміравання зводнай базы звестак такіх каштоўнасці была створана камісія «Вяртанне». Адным з кірункаў работы Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны, які пачаў працу ў 1991 г., стала дзейнасць па выяўленні і вяртанні беларускіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, што знаходзяцца за межамі краіны; цэнтрам сумесна з Нацыянальнай кніжнай палатай Беларусі была распрацавана і доўгі час папаўнялася база даных страчаных каштоўнасцей. У пачатку 90-х гг. XX ст. пры Міністэрстве культуры некаторы час існавала Дзяржаўная камісія па рэстытуцыі. У 2009 г. неабходнасць арганізацыі работы па вяртанню нацыянальных культурных каштоўнасцей зноў знайшла падтрымку на дзяржаўным узроўні — была створана і дзейнічае па сёння Міжведамасная камісія пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі. Камісія стала органам, які забяспечвае ўзаемадзеянне дзяржаўных структур і арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку названай вышэй камісіі «Вяртанне», прыватных асоб, якія дзейнічаюць у мэтах выяўлення і зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Абапіраючыся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на міжнародны вопыт, Камісія выбудоўвае агульнанацыянальную стратэгію вяртання культурных каштоўнасцей, вызначае прыярытэтныя для Беларусі напрамкі дзейнасці па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей; выпрацоўвае прапановы і рэкамендацыі па комплексу пытанняў рэстытуцыі [1],

Актуальнымі і прыярытэтнымі напрамкамі работы ў сферы рэстытуцыі страчаных каштоўнасцей сёння з'яўляюцца:

1) стварэнне базы даных страчаных культурных каштоўнасцей. Гэта прадугледжвае, па-першае, распрацоўку праграмнага прадукта, у якім павінны быць сканцэнтраваныя ўжо назапашаныя матэрыялы; і, па-другое, пастаяннае напаўненне базы даных праз адсочванне аўкцыйных таргоў антыкварыяту і твораў мастацтва, тэматычных публікацый, складання музейнымі ўстановамі пералікаў страчаных аб'ектаў для занясення ў базу;

2) здзяйсненне шэрагу крокаў па вяртанні каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі краіны. Тэарэтычна магчымымі ў дачыненні да Беларусі з'яўляюцца наступныя варыянты:

- фізічнае перамяшчэнне каштоўнасцей, іх непасрэднае вяртанне на тэрыторыю краіны;

- «мяккая» рэстытуцыя — прадугледжвае стварэнне факсіміле, электронных копій страчаных твораў мастацтва; сумеснае выкарыстанне каштоўнасцей, напрыклад праз доўгатэрміновыя дэпазіты.

Прамая рэстытуцыя з'яўляецца вельмі складаным для ажыццяўлення і магчымым толькі пры наяўнасці неаспрэчных доказаў незаконнага перамяшчэння каштоўнасцей варыянтам. Адным са спосабаў рэалізацыі такога падыходу можа выступаць раўнацэнны абмен паміж краінамі культурнымі каштоўнасцямі.

У такім кантэксце нельга пакідаць па-за ўвагай набыццё культурных каштоўнасцей краінай за мяжой, што прадугледжвае вырашэнне шэрагу задач для Беларусі, адна з якіх — распрацоўка механізму ўдзелу прадстаўнікоў краіны ў міжнародных аўкцыёнах твораў мастацтва. Дагэтуль такая дзейнасць не ажыццяўлялася ў сувязі з адсутнасцю адпаведнага заканадаўства, мэтавых фінансавых сродкаў у дзяржаўным бюджэце.

У сучасных умовах найбольш рэальнай для ажыццяўлення бачацца формы «мяккай» рэстытуцыі. Гэта пацвярджаецца ўжо дасягнутымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паспяховымі вынікамі: у 2010 г. было выпушчана электроннае выданне «Кніжны збор роду Храптовічаў» (арыгіналы знаходцзяцца ў г. Кіеве), атрымана электронная копія Лаўрышаўскага евангелля (арыгінал — у музеі Чартарыйскіх у г. Кракаве), рэалізуецца праект па пераводу ў лічбавы фармат бібліятэчных і архіўных калекцый роду Радзівілаў (сумесна з бібліятэкамі і архівамі Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Фінляндыі, на тэрыторыі якіх знаходзяцца часткі архіўна-бібліятэчнага комплексу Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў); створаныя лічбавыя копіі жывапісных партрэтаў прадстаўнікоў роду Нямцэвічаў (арыгіналы — у Калужскім абласным мастацкім музеі), Яна Сапегі, Яна Хадкевіча, Уладзіміра Сыракомлі (арыгіналы — у Нацыянальным музеі Літвы), атрымана копія іконы «Найсвяцейшая панна Марыя» з прыватнай калекцыі роду Радзівілаў і інш. З мэтай ушанавання і папулярызацыі спадчыны І. Луцкевіча з нагоды 130-годдзя з дня нараджэння ажыццяўляецца падрыхтоўка праекта па стварэнні Беларускага віртуальнага музея імя І. Луцкевіча (музей існаваў з 1921 па 1945 г. у Вільні) праз віртуальнае (у Internet-прасторы) аб'яднанне раз'яднаных частак калекцыі, што зараз знаходзяцца на тэрыторыі дзвюх дзяржаў — Беларусі і Літвы. Пашыраецца практыка сумеснага ўтрымання культурных каштоўнасцей — на дэпазіце ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі некаторы час знаходзілася слуцкія паясы з Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве.

Такім чынам, вяртанне ў культурную прастору Беларусі вывезеных за межы краіны ў розныя перыяды гісторыі культурных каштоўнасцей патрабуе планамернай і адданай працы, вынікам якой абавязкова стане сцвярджэнне нацыянальнай годнасці і ідэнтычнасці ў еўрапейскім і міжнародным кантэксце, умацаванне гістарычнай памяці, станаўленне культурных кантактаў з замежнымі краінамі, пазіцыянаванне Беларусі ў свеце як дзяржавы, якая клапоціцца аб захаванні сваіх культурных здабыткаў.

*Літаратура*

1. Аб Камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі : пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 16 студз. 2009 г., № 43 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. — 2009. — № 5. — 5/29151.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Ластоўскі, В. Ю.* Што трэба ведаць кожпаму беларусу / В. Ю. Ластоўскі. — 3-е выд. — Мінск : Тав-ва бел. мовы імя Ф. Скарыны, 1993. —31 с.

3. *Матвеева, М.* Проблемы возврашення кннжных фомдов / *W.* Матвеева // Вяртанне-3 : зб. артыкулаў і дакументаў / Беларус. фонд культуры ; склад. А. Тоўсцік [і інш.]. — Мінск, 1996. — С. 19-23.

4. Council of Europe Framework Convention on the Value of Cultural Heritage for Society // Council of Europe [Electronic resource]. — 2005. — Mode of access http://conventions.coe.int/Treaty/EN/Treaties/Htrnl/199. htm. — Date of access: 02.02.2011.

***Summary***

*The article deals with restitution of lost national cultural values, which is a strategic resource for the approval of a national identity. The article discusses some aspects of the scope of restitution of cultural heritage in Belarus. It identifies the most likely way to return cultural heritage, which was the relocation of overseas countries in different periods of history.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ